№ 3. Панядзелак, 26 верасьня (13 сеньцябра) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

Асобам, палучаўшым першыя два нумары „Беларускіх Ведамасьцей" і дагэтуль ня прыслаўшым падпіскі, — газэта далей пасылацца ня будзе, покуль ня прышлюць грошы.

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

Унутранае змаганьне правых манархічных партыяў з цэнтрам і з левымі ў **Нямеччыне** цягнецца далей. Кабінэт міністраў **Баварыі** падаўся ў адстаўку, чым правыя партыі надта незадаволены. У Берліне адбыўся ўсенямецкі зьезд партыі соцыял-дэмакратаў, на якую абпіраецца цяперашні ўрад Нямеччыны. Зьезд прыняў пастанову: ўсімі сіламі змагацца супроць пагроз справа, з боку манархістаў, і зьлева, супроць камуністаў. Немцы заплацілі хаўрусьнікам другі ўзнос кантрыбуцыі, лічбаю адзін міліярд золатам. Хаўрусьнікі павінны былі ачысьціць правінцыю Рэйна, багатую каменным вугальлем, якую займалі на прыпадак, калі-б немцы не захацелі спаўняць умоў Вэрсальскага міру. Ня гледзячы, аднак, на тое, што немцы спаўняюць свае міравыя ябавязкі, хаўрусьнікі з свайго боку таго ня робяць.

Аўстра-Угорская спрэчка яшчэ ня скончылася. Угорцы хоць і баяцца пагроз Антанты, аднак-жа, чапаюцца за ўсякі спосаб, каб не вярнуць Аўстрыі належных ёй пагранічных земляў. Хоць угорскі міністр заграмічных спраў паведаміў аўстрыяцкага пасла ў Будапешце (сталіцы Угоршчыны) аб тым, што Угоршчына гатова ачысьціць спрэчны край, тымчасам рабіць гэта ўгорцы не сьпяшаюцца, і можна з іх боку спадзявацца яшчэ якога-небудзь фокуса.

Перагаворы прэзыдэнта **Ірляндзкай** рэспублікі Дэ-Валера з старшынёю міністраў Англіі Лойд-Джорджам ізноў перарваліся і пагражаюць горшым абвастрэньнем ірляндзка-ангельскіх адносін.

У некаторых местах **Англіі** выбухнулі крывавыя непарадкі на грунце безрабоцьця.

Армія **Гішпаніі** ў астатні час пачала браць перамогу над паўстанцамі **Марока** і адпіраець іх у глыб краю к афрыканскай пустыні.

Палітычнае становішча **Баўгарыі**, шчыльна зьвязанае з унутранымі парадкамі, зрабілася надта цяжкім, дзеля таго што Антанта (хаўрусьнікі) загадала ёй распусьціць кадравую армію і набраць ахвотніцкую лічбаю ня болей за 20 тысячаў.

Такой арміі баўгарам по-мала ня толькі для абароны граніц, але і дзеля унутранае службы, а злашча затое, што ў Баўгарыі, як і ў сумежнай з ёю **Юга-Славіі** дужа пашыраецца работа камуністаў.

Грэцыя, маючы бязупынную вайну з Турцыяй, бо яе паны і архірэі сьпяць і думаюць аб Канстантынопалю, дайшла да вельмі цяжкога становішча. Яна спадзявалася зрабіць пазычку ў старонках Антанты, але гэта ёй не задалося. Магчыма, што там ізноў пачнецца скіданьне караля прыхільнікамі бываўшага кіраўніка Грэцыі — Венізелоса.

Тымчасам незалежніцкая армія **Турцыі** за астатні час перамагла грэкаў і гоніць яе на ўсім фронце ад сталіцы турэцкіх патрыотаў Ангоры. У Канстантынопалі знайшлі шырокую змову, скірованую супроць канстантынопальскага турэцкага ўраду і хаўрусьнікаў, якія паддзержываюць гэты ўрад.

Нарвегія зацьвердзіла гандлёвую ўмову з Саветамі, прызнаўшы Савецкую Расею дэфакто.

Фінляндыя паслала Савецкай Расеі ноту, вымагаючы спыніць зьбіраньне чырвонай арміі на яе граніцах.

Румынія занепакоена зьбіраньнем чырвонай расейскай арміі на яе граніцах і пільна мабілізуецца.

Савецкая Расея абвесьціла прылягаючую да Румыніі часць Украіны на ваенным стане.

Першыя эшалоны з хлебам для галодных расейцаў ужо прыбылі ў Маскву.

Сваю новую эканамічную палітыку, якая стаіць у супярэчнасьці з ранейшым „ваенным камунізмам", бальшавікі разьвіваюць далей.

Пытаньне аб **Верхняй Сьлезіі** Ліга Народаў, пакуль што, адлажыла, даручыўшы дасканальны разгляд справы сваім сьпецыялістам, а ў **Літоўска-Польскай** спрэчцы выразна схілілася на карысьць Літвы.

У **Польшчы** стварыўся новы кабінэт міністраў.

У **Францыі** шмат дзе забастоўкі.

Амерыка рыхтуецца да Вашынгтонскай канферэнцыі дзяржаў, якая будзе мець вялікае значаньне ў палітыцы.

Новы праект Гіманса.

У Жэнэве ізноў засядае Ліга Народаў і робіць вельмі цікавую і важную для нас работу. Разьбіраецца справа Віленшчыны...

На гэты раз, здаецца, справа аб прыналежнасьці Віленшчыны і яе палітычным устройстве будзе вырашана аканчальна. Гіманс унёс у Лігу Народаў новы праект аб Віленшчыне, па каторачу Віленшчына прызнаецца за Літвой, як адзельная а ў т а н о м н а я п р а в і н ц ы я.

Такім чынам, кантанальнае ўстройства Літвы, пры якім Літва разьдзялялася-б на дзьве часткі, з сваімі аддзельнымі соймамі і ўрадамі ў Коўні і Вільні, новым праектам Гіманса адкінута.

Па новаму праекту Віленшчына будзе не кантонам з роўнымі правамі з Ковеншчынай, а толькі аўтаномнай правінцыяй. Аўтаномія гэта, гарантуючая правы не-літоўцаў, засяляючых Віленшчыну, яшчэ нам пунктуальна ня ведама. Розныя бываюць аўтаноміі. Прадстаўнік Літвы Гальванаўскас заявіў, што Літва згаждаецца на аўтаномію для некаторых літоўскіх правінцый, на манер як гэта зроблена Чэха-Славакіяй з тымі правінцыямі, у якіх няма чэскай большасьці. З гэтага можна вывесьці, што Літва ня мысліць аўтаномнасьць, як палітычную незалежнасьць, і, значыцца, Віленшчына ня будзе станавіць у палітычным сэнсе чаго-небудзь асобнага ад рэшты Літвы. І новы праект Гіманса і палажэньні, выказаныя Гальванаўскасам, маюць паміж сабою многа супольнага. І магчыма, што Літва прыме новы праект Гіманса. Але за тое Польшча наўрад ці прыме яго. Польскі прадстаўнік Ашкеназі ўжо зазначыў на паседжаньні Лігі Народаў, што новы праект Гіманса моцна розьніцца ад папярэдняга (двукантанальнасьць Літвы) і што ў Польшчы ніхто з ім ня згодзіцца. Само сабою разумеецца, што аўтаномія Віленшчыны надае ёй менш правоў, чым каб яна была асобным кантонам. Значыцца, палажэньне палякоў, маючых прэтэнсіі на Віленшчыну, новым праектам Гіманса становіцца горшым. Ітак, можна сьцьвердзіць факт, што пасьля даўгіх спрэчак паміж Літвой і Польшчай з-за Віленшчыны і многаразовых спроб разрашыць тым ці іншым спосабам пытаньне аб прыналежнасьці Віленшчыны да Польшчы ці Літвы, Ліга Народаў схілілася да прызнаньня Віленшчыны Літве, а ня Польшчы.

Літва выіграла бой, Польшча праіграла. Што датычыць тэрыторыі, якая адойдзе пад Літву, то згодна з першым яшчэ праектам Гіманса—Горадзеншчына не адойдзе да Літвы, але за тое так званы польскі „калідор"—паветы Дзісьненскі і Вялейскі—адыходзяць да Літвы, дзякуючы чаму Літва будзе мець беспасрэдныя граніцы з Савецкай Расеяй і Беларусьсю, а Польшча траціць беспасрэдную граніцу з Латвіяй.

М. К.

Пражская нарада

Свабодная палітычная думка беларускага народу дажыла да такіх часоў, што на роднай зямлі ёй няма места. Ня дзіва, што і нарада палітычных беларускіх дзеячоў, прадстаўнікоў свайго гаротнага народу, адбудзецца гэтымі днямі не ў якім-небудзь з цэнтраў Беларусі, а па-за межамі яе — у Празе Чэскай, сталіцы братняга нам чэскага народу.

Ня ведама, ці ўдасцца ўсім беларускім дзеячам, жадаючым быць у Празе, выехаць туды. Пры сучасных палітычных варунках трудна чакаць свабоднага праезду дэлегатаў з Савецкай Беларусі, з Магілеўшчыны, Віцебшчыны, і Смаленшчыны. Гэта—з аднаго боку.

Так сама ня ведама яшчэ, ці можна будзе выехаць у с і м жадаючым выехаць у Прагу палітычным дзеячам Віленшчыны. Відаць, што не.

Разумеецца, ніхто і не спадзяецца на паўнату нарады. Але усё-ж, мы верым, нарада адбудзецца і, спадзяёмся, дасьць добрыя вынікі. Калі ня ўсе, дык многія паасобныя дзеячы з тэрыторыі бацькаўшчыны прыедуць у Прагу. Калі ня ўсе, дык большасьць нашых палітычных кірункаў будзе там прадстаўлена.

Здаровы розум зьехаўшых прадстаўнікоў усіх напрамкаў падскажа патрэбныя рашэньні.

Мы адмаўляемся верыць у магчымасьць прынцыповай нязгоды па аснаўным пытаньням беларускай справы, — навет з боку найбольш хістаючыхся нашых палітыкаў.

Не такі цяпер мамэнт, каб еварыцца паміж сабою. Трэба шукаць паразуменьня, каб стварыць адзіны фронт. І тыя, хто так ці іначай стаяў за урад Ластоўскага, і так званыя „найвышэйшыя", і нарэшце „дзікія" павінны дагаварыцца, каб не разьбіваць надалей сваёй працы на кірункі, адзін аднаго зьнішчажаючыя.

Калі-б не ўдалося знайсьці залатой сярэдзіны, то разлом, які цяпер ёсьць у палітычных беларускіх сфэрах, узрос бы яшчэ болей і павёў бы да аканчальнага разладу і разрыву паміж вядомымі палітычнымі беларускімі групіроўкамі.

М. К.

Што чуваць у сьвеце?

Справа Заходняе Галіцыі.

У дыплёматычных колах Францыі пануець пракананьне, што Англія дакладаець стараньняў, каб на паседжаньні Лігі Народаў разьвязаць справу Галіцыі разам з справаю Верхняй Сьлезіі і Віленшчыны. (Е. Е.).

Камуністычная прапаганда ў польскай арміі.

У Кракаве арыштавана некалькі польскіх афіцэраў за бальшавіцкую агітацыю („Вперед!").

Паўстаньне ў Індыі.

Паўстанчы рух ў Індыі пашыраецца што раз болей. Англія змушана выслаць новыя транспарты войска. Паўстанцы пазабівалі шмат ангельскіх урадоўцаў і непакояць далей ангельцаў. (П.А.Т.).

Соцыялістычны рух ў Аўстрыі.

Выбары ў салдацкія рады ў аўстрыйскай арміі далі перавагу соцыялістам. Выбрана 400 салдацкіх рад, у якіх камуністы здабылі 84 мандаты. („Вп.").

Змова пятлюраўцаў у Кіеве.

„Красная газета" друкуе падробнасьці аб змове пятлюраўцаў у Кіеве, якая мела на мэце скінуць савецкі лад на Украіне і паставіць урад Украін. Народн. Рэспубл. Працавала 13 дужа пашыраных арганізацый. Усеукраінскі паўстанчы камітэт працаваў у паразуменьні з Пятлюраю і Тутунікам. Бальшавікамі зроблена шмат арыштаў.

Новы склад міністраў у Польшчы.

У новы склад польскіх міністраў увайшлі: старшынёй міністраў і міністрам веры і асьветы, а разам кіраўніком міністэрства культуры і мастацтва—п. Панікоўскі, рэктар Варшаўскага палітэхнікума; міністрам унутраных спраў—п. Даўнаровіч; заграмічных—ранейшы міністр п. Скірмунт (далёкая радня вядомага беларускага Скірмунта, вялікага абшарніка Пінскага павету); вайсковых—ген. Сасьнкоўскі.

Для беларусаў цікаўна толькі зьмена міністра унутраных спраў п. Рачкевіча, жанатага, як кажуць, з дачкою нашага песьняра 90-х гадоў Няслухоўскага (Янкі Лучыны), але вядомага беларусам па Вільні і па Менску з зусім адваротнага боку. Зьмена гэтая павінна так ці гэтак адбіцца на рабоце пана Аляксюка, які разьбіваў і разьбівае беларускі нацыянальна-палітычны фронт, то абвяшчаючы урад Бел. Нар. Рэсп. стаячым не ў законе, то арганізуючы розныя падазроныя „Еднасьці" і „Краёвыя сувязі", найбольш карысныя для яго асабіста. Можна сказаць, што Аляксюк завёў беларускую работу пад Польшчаю у страшэнна цяжкі тупік і аканчальна папсаваў беларуска-польскія адносіны. А рабіў ён гэта, надта блізка стоячы да п. Уладзіслава Рачкевіча. Так што, хоць мы яшчэ ня ведаем пана Даўнаровіча, аднак, шкадаваць аб зьмене, мабыць, ня будзем.

Іменьні другіх новых польскіх міністраў нам, пакуль што, дужа мала знаёмы.

Дзікасьць угорцаў (венграў).

Пражская газэта „Народны Лісты" апісуець дзікасьць угорскіх бандаў у Заходняй Угоршчыне: угорцы абдзіраюць насяленьне пакінутых аўстрыйцамі гарадоў і нішчуць ураджай. Насяленьне грудам уцякае ў Аўстрыю. Усе чакаюць умяшаньня Чэха-Славакіі (Л.Т.А.).

Няшчасьце Пракаповіча.

Некаторыя газэты паведамляюць, што Маскоўская чразвычайка засудзіла на сьмерць бываўшых сяброў Камітэта Помачы галадуючым Кішкіна, Пракаповіча, Кускову і інш., але Спаўняючы Камітэт Саветаў задзержыў пакараньне і забраў да сябе на разгляд усе дакумэнты аб гэтай справе.

Пракаповіч—вядомы ў Расеі і за граніцаю грамадзкі дзеяч, кааператар, астатні час быў прафэсарам у Пятроўска-Разумоўскай Акадэміі ў Маскве, дзе шмат рабіў для эканамічнага пазнаньня Беларусі. Ён беларус, родам з Гарэцкага павету Магілеўшчыны, чалавек расейскай культуры, але верны сын Беларусі і спагадчык нашага руху. Выкладаючы навукі ў Акадэміі, ён, разам з праф. Фартунатавым, многа памагаў тамтэйшай Асоцыяцыі студэнтаў-беларусаў, рыхтуючы іх для эканамічнага падняцьця Беларусі. Кускова, вядомая пісьменьніца і грамадзкая дзеячка—яго жонка.

Што сказаў Мікола Сьляжэвіч?

Мікола Сьляжэвіч, выдатны літоўскі дзеяч, правадыр літоўскай народна-соцыялістычнай партыі, у размове з супрацоўнікам газэты „Эхо" між іншым сказаў:

„Пытаньне аб Вільні надта ўжо баліць, каб дазволіць яму і далей вісьнуць у паветры. Мы стаім за некаторыя згоды, за перагаворы, за ўстанаўленьне добрасуседзкіх адносін з Польшчаю, але ўсё гэта ў р а м к а х н е д а т ы к а л ь н а с ь ц і н а ш а й п о ў н а й н е з а л е ж н а с ь ц і."

Аб новым праекце Гіманса М. Сьляжэвіч сказаў, што некаторыя пункты ў ім ані ніяк ня могуць быць прыняты Незалежнаю Літвою. Такія пункты: 5-ты (арганізацыя арміі), 8-мы (агульная рада ў заграмічных справах) і п у н к т ы, у я к і х г а в о р ы ц ц а а б м о в е і п р а в о х н а ц ы я н а л ь н ы х м е н ш а с ь ц я ў (як вядома, праект прызнае дзяржаўнымі мовамі ў Літве — літоўскую і польскую). М. Сьляжэвіч кажа:

„Што датыча мовы, то гаспадарственаю можаць лічыцца толькі адна: літоўская. Польскай-жа, як і жыдоўскай і б е л а р у с к а й, наданы будуць найшырэйшыя правы на агульных для ўсіх падставах. І наагул мы гатовы надаць нацыянальным меншасьцям самыя шырокія правы ўва ўсіх галінах гаспадарственага жыцьця па правілу таго дэмакратызма, каторы мы жадаем спраўджываць ўва ўсіх сваіх дзеяньнях"...

Неўзабаве аб Беларусі загавораць.

Газэта „Эхо" ў № 221, за 18 верасьня пішаць:

„Нядаўна мы выказывалі ў адным з перадавых артыкулаў згадку, што ў зьвязку з цьвёрдым замерам Лігі Нацый разьвязаць літоўска-польскую спрэчку ня толькі з пункту, але і ўва ўсіх яе драбнейшых частках, само сабою павінна здабыць штодзенную вострасьць і прыцягнуць да сябе самую напружаную ўвагу пытаньне аб Беларусі. Відаць, наша згадка спраўдзілася і ў такіх знамянальных па сваей яўнасьці формах, як прапазыцыя Рады Лігі Народаў аднаму з міністраў беларускага ўраду—п. Цьвікевічу прачытаць адпаведны даклад і абзнаёміць Лігу Нацый з становішчам насяленьня Беларусі і палітычнымі кірункамі і мкненьнямі беларускіх грамадзкіх групаў. Нам яшчэ невядомы рэзультаты і падробнасьці гутарак п. Цьвікевіча з прадстаўнікамі кіруючых колаў Лігі Нацый, апроч іх п е ў н ы х з а я ў а б п а л і т ы ч н а й п а д д з е р ж ц ы і м о р а л ь н а й п о м а ч ы б е л а р у с к а м у н а р о д у ў яго справядлівых і законных жаданьнях, але мы лічым сваячасным спамянуць і аб тым, што за некалькі дзён назад і ў літоўскіх правячых колах было ўзноў высунута пытаньне аб узмацненьні унутранай сувязі з беларускім народам, каторы ў недалёчкай будучыне акажацца нашым суседам і падарожнікам на шляху дзяржаўнага будаўніцтва.

Нам пераказуюць, што надоячы адбылося некалькі сустрэч і палітычных гутарак, меўшых надзвычайна дружбавы характар, кіраўнікоў нашай (літоўскай) дзяржаўнай палітыкі і правадыроў соймавых партый з прадстаўнікамі Ураду Беларускае Народнае Рэспублікі".

У Віленшчыне і Горадзеншчыне наша мова павінна быць дзяржаўнаю.

Ковенская газэта „Эхо" пішаць (№217, 14 верасня):

„Нам пераказалі, што ў прыватнай гутарцы прадстаўнікоў Літвы і Польшчы з Гімансам, Гіманс выказаў сваё зьдзіўленьне, чаму Польшча настоівае на прызнаньні гаспадарственымі мовамі толькі літоўскай і польскай, калі ў Віленшчыне ёсьць яшчэ беларусы і жыды, лічэбнасьцю сваёю перавышаючыя палякоў. На гэта прадстаўнік Варшавы адказаў, што ў гэтым прыпадку ён бароніць толькі нацыянальныя інтарэсы палякоў і нічога ня мае супроць наданьня гэткіх сама правоў і другім народнасьцям."

Зварочваем на словы Гіманса увагу нашых чытаньнікаў. З іх відаць, што справа нашай мовы, як дзяржаўнай, не стаіць так дрэнна, як здавалася з праекту Гіманса. У свой час беларуская дэлегацыя, бываўшая ў Гіманса прасіла яго, каб ён, як соцыяліста і справядлівы чалавек, узяў-бы на сябе абарону нашых інтарэсаў. Цяпер ёсьць ведамасьць, што аб беларускіх справах дакладаў Радзе Лігі Народаў міністр заграмічных спраў Беларускай Народнай Рэспублікі доктар Аляксандар Цьвікевіч. Можна верыць, што ён патрапіў, між іншым, давесьці Лізе Народаў, што ў Віленскім Кантоне і наша мова маець поўныя правы стацца гаспадар-

ственаю моваю. Так што, калі прадстаўнік Варшавы дадзержыць сваё слова і нічога ня будзе казаць супроць нашай мовы, Ліга Нацый без усякай перашкоды пастановіць і яе лічыць дзяржаўнаю. Прыйшоў час, калі Урад Беларускае Народнае Рэспублікі павінен напружыць усе свае сілы ў абароне беларускіх інтарэсаў. Прыйшоў час, калі і яго хаўрусьнікі маюць паказаць запраўдную прыхільнасьць да беларускага народа. Будзем верыць, што гэтак станецца; што не дадуць нікому пакрыўдзіць беларусаў лішні раз, што і мы пры разьвязаньні польска-літоўскай спрэчкі дастанем усе належныя правы.

Беларуская дэлегацыя у Лізе Народаў.


КОЎНЯ, 13 верасьня (Эльта). 11 верасьня прэзыдыум Лігі Нацый прыняў беларускую дэлегацыю, катора ўручыла мэморандум па беларускаму пытаньню.

Расейскія чарнасоценцы растрэліваюць беларусаў.

КОЎНЯ, 13 верасьня (Эльта). Па загаду генарала Кутепова ў Галіполі быў растрэлен паверааны беларускага консулату капітана Гарботка. Капітан Гарботка прыехаў з Канстанстынопаля ў Галіполі з дазволу француcкага генаральнага камісара для рэестрацыі беларускіх салдатаў і ўцекачоў у Галіполі. Па гэтай справе робіцца сьледзтва.

Беларусь на кангрэсе прыгнечаных нацыяў.

10 верасьня беларуская дэлегацыя зрабіла ў пленарным пасяджэньні кангрэсу прыгнечаных нацыяў у Жэнэве паведамленьне аб палажэньні Беларусі.



Я. Колас.

Родны край.

О, край родны, край прыгожы,
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей ёсьць ў сьвеце Божым
Гэтых сьветлых берагоў,
Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе лясы-бары гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць?!
Гэтых гмахаў безгранічных,
Балатоў тваіх, вазёр,
Дзе пад гоман хваль крынічных
Думкі думае прастор;
Дзе увосень плачуць лозы,
Дзе ўвясну лугі цьвітуць,
І шляхом старым бярозы
Адзначаюць гожа пуць?..
Гэй, адвечныя курганы,
Сьведкі прошласьці глухой!
Кім вы тут панасыпаны?
Чыей воляю, рукой
Вы раскіданы па полі,
Даўных спраў вартаўнікі?
Ды ня скажаце ніколі,
Што казалі вам вякі,
І пуцінаю няроўнай
Бяжыцё ў далячыню—
У бок Віліі чароўнай
І пад сьветлую Дзьвіну...
Край мой родны! Дзе у сьвеце
Край другі такі знайсьці,
Дзе-б магла так поруч з сьмецьцем
Гожасьць пышная ўзрасьці?
Дзе-бы об-руку з галечай
Расьцьвіцеў багацьця цуд
І дзе-б з долі чалавечай
Насьмяяліся, як тут?..
Скрозь вяночкі дрэў вясёла,
Над мястэчкам ці сялом,
Божы цэрквы і касьцёлы
Узносяць вежы к небясом.
Брацьця мае беларусы!
У страшнай кнізе людзкіх спраў
Мусіць сам Бог для пакусы
Гэты край наш адзначаў.
Тут схадзілісь ўсе плямёны
Спорку сілаю канчаць,
Каб багата адароны
Мілы край наш зваяваць
І самых нас ўзяць ў няволю,
Путы зьдзеку налажыць,
Кінуць ў цяжкую патолю,
Аб нас памяць ўсю замыць.
І лілася кроў нявінна,
Швэд набытак наш паліў,
І маскаль тут самачынна
Гвалт пад намі утварыў,
І бяз жалю капытамі
Конь казацкі тут ступаў
І збажынку з ярынамі
Талачыў і драсаваў;
І на нашых станавішчах
Білісь Польшча і Літва,
Каб на гэтых пажарышчах
Узмацавалася Масква.
Толькі-ж, брацьця, край ня згінуў,
Не пагнуўся яго стан,
І із нас душы ня вынуў
Ні маскаль, ні польскі пан.
Гэй, суседзі, нашы брацьця!
Ня згубілі мы свой шлях,
Не ўламала нас няшчасьце,
Не сагнуў нас жыцьця гмах.
Дык хіба-ж мы праў ня маем,
Сілы—шлях свой адзначаць
І сваім уласным краем
Край свой родны называць.

Я. Колас.

СЛАЎНЫЯ УГОДКІ.

14 верасьня (1 сенцябра), калі выйшаў першы нумар „Беларускіх Ведамасьцей“, споўнілася роўна 15 гадоў з дня выхаду ў сьвет „Нашае Долі“.

14 *верасьня* (*1 сенцябра*) 1906 *года выйшаў у Вільні першы нумар першай легальнай* (*не падпольнай*) *беларускай газэты „Наша Доля“*.

Гэты дзень лічыцца сьвятам нашага адраджэньня і быў ён важным пунктам у гісторыі нашае літэратуры і культуры наагул.

Пісала ў „Нашай Долі“ рэвалюцыянэрка „Цётка“ (А. Пашкевіч), памёршая 5 лютага 1916 года, пісалі яшчэ: стары пісьменьнік Ядвігін Ш. (А. Лявіцкі), Дзядзька Пранук (Ф. Умястоўскі), Вацюк Тройца (В. Івапоўскі), а з маладзейшых—наш вялікі сучасны поэт і пісьменьнік Якуб Колас і найбольшы цяперашні публіцыст, заслужоны дзеяч Антон Навіна (Антон Луцкевіч) і інш.

Апроч таго, глаўным пачынальнікам і духоўнаю падпораю ў гэтай справе быў таксама нябожчык Іван Луцкевіч (1881—1919), правадыр нашага руху праз увесь пазьнейшы час.

Нумары „Нашай Долі“ зрабіліся цяпер дарагой бібліаграфічнай рэдкасьцю. Усяго выйшла 6 нумароў, з каторых ажно 5 падпала пад паліцэйскую забарону.

Вестка аб легальнай газэце, пісанай пабеларуску, пракацілася па ўсёй Беларусі, як першы веснавы гром. Людзі плакалі ад радаснае навіны і ад горкіх успамінаў.

А на вуліцах Вільні газэту бралі нарасхват, чыталі разам вялікімі грудамі, плацілі часам нязвычайныя грошы.

Калі-ж газэта дайшла ў правінцыю, сяляне сталі прысылаць у рэдакцыю дужа многа пісьмаў з гарачымі, натхненымі і радаснымі словамі абуджаных сыноў па... ромнае бацькаўшчыны.

АБ „НАШАЙ ДОЛІ“.

Гэта было летам 1906 году, калі я прышоў да пракананьня, што мінуў беспаваротна час Калядных і Вялікодных пісанак, якія мы ў гуртках беларускіх у Маскве і Пецярбурзе друкавалі на гэктографах у некалькіх дзесятках экзэмпляраў. Настаў час, калі беларускае друкаванае слова павінна шырокай ракой ліцца ў нашу цёмную бяздольную вёску і гукамі роднай мовы будзіць людзей да лепшага жыцьця і сьвет пазнаньня нясьці ў курныя мужыцкія хаты.

Я ведаў, што ёсьць людзі, якія не пашкадуюць працы для гэнай справы; я знаў, што вёска прыхільна прывітае першую ластаўку беларускай вясны, але ня было толькі аднаго—грошы, і дзе іх дастаць, я ня ведаў. Вось калі гэтак я насіўся з думкаю аб грошах—яны самі прышлі да мяне. Неяк яшчэ ў гімназіі я пазнаёміўся з Янам Тукеркесам. Бацькі яго, хрышчоныя жыды, мелі ў Вільні хатку на Новым Сьвеце, недалёчка ад таго мейсца, дзе жыў і я. Гэтак дзякуючы суседзтву завязалася знаёмасьць у нас. У тым часе, аб якім ідзе гутарка, бацька Тукеркеса памёр, пакінуўшы пану Яну хатку і некалькі тысячаў грашыма. Пачуўшы грошы ў кішані, пан Ян закруціўся. Малады прыгожы дзяцюк загуляў, і грошы пачалі ўцякаць. Разглядзеўся пан Ян, што



Цётка.

гэтак доўга не працягнеш, і надумаў на астаткі бацькаўскага добра пачаць які інтэрас. Гэткім добрым інтарэсам здалася ему расейская вечаровая газета, і ведаючы, што я знаюся па газэтнай справе, ён прышоў на раду да мяне. Разгавары-

Паўлюк Бахрым—першы вядомы у нашай літэратуры пясьняр сялянскага роду.

Паўлюк Бахрым—селянін з Крошына, Слуцкага павету, Менскай губэрні. У 1828 годзе ён вучыўся разам з другімі мужыцкімі дзяцьмі ў школе ксяндза Магнушэўскага. Гэты ксёндз быў шчыры прыхільнік працоўнага народу, хацеў падняць людзей з голаду і цямноты і памагаў крошынцам проціў пана судзіцца за зямлю. Дзяцей ён вучыў чытаць, пісаць, лічыць, разумець катэхізм, апрача таго, даваў чытаць добрыя кніжкі. Хлопчык Бахрым надта спадабаў пісаць вершы, пераймаючы напісаныя ў кнізе. Многа вершаў з польскага пісьменніка Нарушэвіча, баек Эзопа ды чаго іншага ўмеў ён напамяць; таксама любіў сьпісываць усё, што пападалася пад рукі, ня толькі друкаванае, але і рукапіснае. Так разьвівалася яго сьвядомасьць. Посьле, калі крошынскіх сялян засудзілі за „бунт“, а школу зачынілі, у вучня Бахрыма начальства знайшло вершыкі, каторыя здаліся яму вельмі шкоднымі і небясьпечнымі. Паліцыя забрала іх і шукала, ці няма яшчэ. Ксёндз Магнушеўскі на выпытах дужа хваліў Бахрыма, а ня ведаўшы, на што ў яго пытаюцца, казаў, што хлопчык умее напамяць значна болей сваіх вершыкаў, чымся ў яго адабралі запісаных. Князь Радзівіл даказаў, што вучні ў школе дэклямавалі нягожыя для сялянскіх дзяцей байкі і розныя вершы. Тады Магнушэўскага аддалі пад нагляд паліцыі, Паўлюка Бахрыма неўзабаве здалі ў маскалі, а многа сялян выслалі ў Сыбір. Добры ксёндз пажыў пасьля таго мала і памёр з гора, а якое было патым жыцьцё Паўлюка Бахрыма, ніхто вестак дагэтуль не сабраў. Кажуць, што ён з войска вярнуўся, жыў у Крошыне і памёр ў 1891 годзе.

Творы Паўлюка Бахрыма не захаваліся, апрача тых некалькіх, што пайшлі ў народ. Адзін сьпісак яго „вострых“ вершыкаў узяў сабе сэнатар Навасільцаў ці прафэсар Пэлікан, каторыя прыяжджалі ў Крошын даведацца аб тым „бунце“ і вельмі дзівілісь на паэта-самародка, дэкляруючы навет паклапаціцца аб яго ўзгадаваньні. Есьць толькі адзін друкаваны вершык Бахрыма, гэта — „Заграй, заграй...“ Апрача таго, кажуць, ён злажыў „Гутарку Данілы з Сьцяпанам“ і „Размову пана з мужыком“, каторыя запісаны ад народа этнографамі.

„Заграй, заграй, хлопча малы“... — лірычная песьня аб цяжкім жыцьці ў часе паншчыны. Бацьку песьняровага забілі кіямі, маці яго тужыць, сястра плача, а самаго яго сярдзіты крошынскі пан здаець у маскалі. Песьня пераймае народную творчасьць, але сьведчыць [illegible] рым знаёмстве аўтора з кніжкаю. Напісана яна з запраўдным поэтычным патхненьнем і шчырым чуцьцём, ахоплена-ж далікатнасьцю засмучонага настрою. Способ думаньня — абразны, параўнаваньні і звароты мовы—народныя.

„Гутарка Данілы з Сьцяпанам“ па складу верша не падобна да разгледжанай песьні, але ўвесь яе тон і думкі лёгка нагадуюць бахрымаўскую творчасьць. „Гутарка“ была дужа пашырана, як рукапісны твор нявядовага аўторства. Магчыма, што Бахрым схаваў імя і не падпісаўся навет псэўданімам, баяўшыся паноў. Твор напісан перад вольніцай. Даніла з Сьцяпанам талкуюць аб тым, што паны ня хочучь, каб цар даваў вольніцу. Чуецца, што аўтор „Гутаркі“ сам мужык; ён глыбока адчувае мужыцкую няволю, ненавідзіць паноў і вельмі жадаець скасаваньня прыгону. Але сьветагляд яго не расшыраны кніжнай адукацыяй, думкі прастадушныя, патрэбнай для дзейнага адраджэньня нацыянальнай і соцыяльнай сьвядомасьці няма. Аўтор ня ведае таго, што цар такі самы злосьнік для народа, як і ўсякі пан, яшчэ навет горшы па сваей сіле.

З тэхнічнага боку „Гутарка“ і „Размова“ стаяць нізка. Відаць, пясьняр мала клапаціўся аб надворным харастве сваіх твораў, а ўсё стараньне пакладаў на пералічаньне соцыяльных злыдняў. Яно й ня дзіва, бо гэткая была пара, што такім якраз спосабам найлягчэй было прамовіць да мужыцкае душы. І творы Бахрыма пайшлі ў гушчу народа, дзе ня толькі пабуджалі беларускасьць, але надавалі ёй выразнага соцыяльнага выгляду. У гэтым галоўная літэратурнагістарычная заслуга Бахрыма. Ен —самы першы пісьменьнік з мужыкоў. Меў усе задаткі, каб зрабіцца беларускім Шаўчэнкам, адылі адсутнасьць адукацыі і жыцьцёвае гнібеньне тут перамаглі. Усёжткі сваім маласьвядомым і задушаным словам сказаў проці зьнявагі і ўціску і кінуў сьлед у гісторыі нацыянальнага і літэратурнага адраджэньня.

З твораў Паўлюка Бахрыма.

* *
*

Заграй, заграй, хлопча малы,
І ў скрыпачкі і ў цымбалы.
А я заграю у дуду,
Бо ў Крошыне жыць ня буду.
Бо ў Крошыне пан сярдзіты,—
Бацька кіямі забіты,
Маці тужыць, сястра плача...
Гдзе-ж ты пойдзеш, небарача?
Гдзе я пайду? Мілы Божа!
Пайду ў сьвет, у бездарожжа,
У ваўкалака абярнуся,
Сьмела на вас абярнуся.
Будзь здарова, маці міла!
Каб ты мяне не радзіла,
Каб ты мяне не карміла,
Шчасьліўшая ты-бы была!
Каб я каршуном радзіўся,
Я-бы без паноў абыўся:
У паншчыну-б не пагналі,
І ў маскалі не аддалі.
Мне пастушкам век ня быці
І ў маскалях трудна жыці,
А я і расьці баюся,
Гдзе-ж я, бедны, абярнуся?
Ой, кажане, кажане!
Што-ж ня сеў ты на мяне?
Каб я большы не падрос
Ды ад бацькавых калёс.

„Маладая Беларусь“, т. 2.

Гутарка Данілы з Сьцяпанам.

Зышоўшысь Даніла сьвятым днём з Сьцяпанам,
Харошаю пагодаю селі пад парканам,
Ды й ну-ж талкаваці, ды й ну-ж гаварыці,
Што далей з нас будзе, як мы будзем жыці.
Гавораць на сьвеце, у голас талкуюць,
Ад ксяндзоў, ад жыдоў усе людзі чуюць,
Што вольнасьць нам, бедным, дасьць цар без адкладу,
Толькі што з панамі не дайдзема ладу.
Чаго адны хочуць, то другім ня міла.
Як чорт перад д'яблам, пражэцца іх сіла.
Цар ім патурае, а яны хітруюць,
Змовіўшысь з сабою, цару так талкуюць:
„Пане найясьнейшы, што з гэтага будзе,
Даўшы усім вольнасьць, кажан тое згудзе,
Што мужык бяз пана быць ніяк ня можа,
Паб'юцца, паколюцца, сьцеражы Ты, Божа;
Над ім трэба што дзень з кнутам стаць над каркам,
Розгі каб ляжалі возам за хвальваркам,
Гразы як ня будзе ад двара над хамам,
Заб'юцца, паколюцца на век вякоў амэн!
Мужык без гарэлкі перабыць ня можа,
П'яны ня уступіць, сьцеражы Ты, Божа,
А як стане біцца, кала яму трэба,
Хоць дзяцём у хаце няма куска хлеба,
А як пана мае, то мужык баіцца,
Хоць кары ня возьме, то хоць надрыжыцца,
Бо знае, што яго пан за ўсё скарае;
З хама ніц*) ня будзе, як пана ня мае“.
От, браце, як яны падлыгаць умеюць,
Перад царам ў вочку на нас плесьці сьмеюць,
Ім гэта нясмашна костка ў горле стане,
Як мужык бяз пана вольнасьць дастане.
Што хочуць, то баюць, лгуць, як самі знаюць,
Верыць ім цар сьмела, яны ласку маюць,
А мы бедны, браце, церпім скрозь няволю,
Праклінаем жыцьце, сваю горку долю.
Праўда, што ня чулі дзяды ні айцове,
Каб над мужыкамі ня былі панове,
Ды цяпер на сьвеце ўсё іначай строяць,
Ужо на сярмягі ды сурдуты кроюць.
Трэснуць яны, лопнуць, ужо іх ня будзе,
Бо ўжо рэчы сталі у цара у людзі:
Каб быў мужык волен, ды цар яго панам,
Ды каб ня сьмеў ніколі зваць пан яго хамам.
Будзе тое, браце, дажджом, мой Сьцяпане,
Што пан на нас скажа: мой каханы пане.
Мы на іх ня глянем і шапкі ня здымем,
Хоць блізка нас будуць, ня кланяўшысь мінем.
Годзе іураднік хванабэр'і строіць,
Каўбасы, пячэні на тарэлцы кроіць,
Перастане клікаць стоража, старожкі,
Каб давалі сухіх дрэвак пад трыножкі;
Вады, каб прынесла сьвежае з крыніцы,
Каб міскі і ложкі падала бяленькі.
Саганы і рондлі, як люстра, ясьненькі.
Вычвараць ня будзе за пражу і ніці,
Перастане тоўчы, папіхаць і біці,
Ня будуць ганяці вайты ад паўночы
На прыгон, заліўшы гарэлкаю вочы;
Пакіне нас лаяць за касьбу, гараньне,
За жніво, грабеньне і стагоў складаньне,
Што часам спазьніўся стаці да работы,
Што робіш памалу як-бы без ахвоты.
А як часам прыдзеш чаго папрасіці,
Нямаш чым гараці, нямаш чым касіці:
Будзь ласкаў, паночку, паратуй ў прыгодзе —
Аж ён крычыць, лае—нямаш канца, годзе.
А каня ці хлеба дастаць вельмі трудна:
Пан сам нездаровы, паня нешта нудна,
Прыдзі другім разам—а тымчасам ў полі
Ня зробіш у пору работы ніколі,
Бо і на прыгоне нямаш чым рабіці,
І ў дома на полі ні на парог выці;
Ідзі, хоць ты трэсьні, не паспагадаюць,
Ніякае ўвагі над намі ня маюць.
Дажджом рабі дома, пагода як бліcьне,
Душа а ніводна у хаце ня пісьне,
На прыгон бяз шчоту з сярпом і з касою,
Валэ да гараньня, коні з бараною.
Ты—паліць вугольле, той рыбу лавіці,
Таму сянавапі, кусты церабіці,
Той павязе водку, а той муку, збожжа—
Работ загадаюць, сьцеражы Ты, Божа!
Таму сена грабіць, таму стог складаці,
Таму тарпы класьці, таму падаваці —
Згінь, прападзі, ліха! Да чорта работы,
Дзіва, што ня стане часам і ахвоты!
Прыдзе восень, зараз: «Дай даякла»!—ганяюць,
Грыбэ, яйцы, куры, талькі адбіраюць.
Магазын алсып, аддай да зярняці,
Бяз куска хлеба аставайся ў хаце,
І чынш і [illegible] аддай без адкладу,
На рэкрута, [illegible]—нямалі складкам ладу!

*) Нічога.

ліся. Што-ж, кажу, браточку, шукаць табе лепшага інтарэсу, як выдавецтва беларускай газэты? І людзям карысьць будзе і грошы заробіш і часам яшчэ ў гісторыю пападзеш. Слова за словам, і Тутеркес праканаўся, што беларуская газэта пойдзе і, калі ня дасьць барыша, то скупіць сябе. „Добра, згадзіўся пан Ян: будзем выдаваць, толькі глядзі, каб да часу ў нейкую гісторыю не папасьці“.

Тутка я пазнаёміў Тутеркеса з братамі Луцкевічамі і Алёізай Пашкевічанкай, што вядома была у беларускіх гуртках пад прозьвішчам Цёткі. Луцкевічы і Цётка з ахвотай абяцаліся памагчы і зараз-жа з усей энэргіяй прыняліся да работы. Хутка Ян Тукеркес адтрымаў дазваленьне на выдавецтва „Нашае Долі“. Фактычным і афіцыяльным рэдактарам меўся быць я, але паводлуг закону мне не хапіла гадоў (я меў толькі 23, а трэба было меці ня меней 24) для права падпісываньня газэты. Гэткім чынам Ян Тукеркес зрабіўся выдаўцом і падпісываў газэту, як рэдактар, хаця паміж сабою мы згаварыліся, што ўсю рэдактарскую працу буду весьці я. Антон Луцкевіч і Цётка увайшлі у рэдактарскую калегію.

Наладзіўшы гэтак справу, я паехаў да маёнтку Лябёдкі, да Вацлава Іваноўскага, каб адпачыць трошкі і, паслухаўшы гоману родных лясоў, зьвярнуцца да Вільні толькі тады, калі ўсе тэхнічныя справы будуць скончаны і трэба будзе выпушчаць першы нумар. Праз некалькі часу я адтрымаў ад Тукеркеса ліст, у якім ён мне пісаў, каб я хутчэй прыяжджаў да Вільні, бо сам ён ня можа паладзіць з Луцкевічамі. Сягоньня не памятаю, з чаго у іх пайшла сварка: досьць таго, што прыехаўшы я усіх згадзіў, і праз некі тыдзень вышаў першы нумар „Нашае Долі“. Калі а гадзіне 12-ай са сьвяжусенькім першым нумарам „Н Д.“ я вышаў з друкарні, у якой прасядзеў бяз мала ўвесь дзень, робячы карэктуру і соткі разоў прачытваючы тыя словы, што хутка палятуць да родных вёсак, сэрца ў мяне стукала ад радасьці і шчасьця, а можа і ад трывогі разам за будучыну нашага дарагога дзіцяці. Прышоўшы ў рэдакцыю на Віленскай вуліцы, я знашоў там усю кампанію. Быў тут Ян Тукеркес, і Антон і Ян Луцкевічы, і Цётка, і Станіслаў Сымановіч—экспэдытар газэты, здаецца, што праездам з Менску быў і Трэпка. Усе з нецярпеньнем чакалі майго прыходу, і газэту амаль не парвалі, выдзіраючы з рук адзін ў аднаго.

Ня ведаю, скуль узялася гарэлка і закуска, і наліўшы чаркі, ня гледзячы на косыя пагляды Цёткі, якая не цярпела п‘ючай кампаніі, мы духам асушылі іх за будучыну бацькаўшчыны.

Гэтак да познай ночы мы гулялі на хрэсьбінах „Нашае Долі“. Пад уплывам радасьці, якую нямінуча нясе з сабою спаўненьне гадаваных цэлымі гадамі думак, ніхто з нас пэўна непрадстаўляў сабе, што гэты момант — момант гістарычны, і зерне, пасеянае сягоньня, дасьць такі буйны ураджай. Мы ня былі аналітыкамі і, прыступаючы да працы над стварэньнем газэты, кіраваліся ня гэтулькі выкладкамі розуму, колькі наказам маладых сэрцаў і вялікай любоўю да цёмнага нашага брата. Мы верылі, што цемру нашай вёскі можа асьвяціць толькі слова ў народнай мове беларуса, што паміма гэтага шляху беларусу няма іншае дарогі да сьвету і долі.

„Наша Доля“ нарабіла шуму. Першы нумар ў ліку 10.000 экзэмпляраў (5000 лацінкай і 5000 кірыліцай) разышоўся амаль увесь. Прадажа газэты ў Вільні йшла так бойка, што газэтчыкі раз-за-разам прыходзілі ў рэдакцыю па новую порцыю, распрадаўшы ў працягу некалькіх мінут узятыя імі пробныя нумары. У Менску і паветах газэта так сама пашла добра. Хутка аб‘явіліся падпісчыкі і беларускія пісьменьнікі. Адным з першых супрацоўнікаў, што пачалі прысылаць свае творы у „Н, Д.“ былі Ядвігін Ш., Якуб Колас і др. Другі нумар газэты грамадзянства спаткала так сама прыхільна, як і першы. Газэтчыкі за некалькі дзён прад выхадам яго прыносілі ў рэдакцыю грошы, каб запясьпечыць сябе загадзя адтрыманьнем газэты. Падпісчыкаў з кожным днём прыбывала усё болей і болей, рэдакцыя з усіх канцоў Беларусі адтрымлівала шмат лістоў, у каторых іх аўтары горяча віталі „Нашу Долю“. З кожным днём паміж газэтай і беларускім грамадзянствам завязываўся цясьнейшы вузел, і папулярнасьць газэты расла з кожным днём. Аб папулярнасьці „Н. Д.“ сьведчыць, паміж іншым, той факт, што некаторыя стацьці вывучываліся чытачамі на памяць. Я сам быў сьведкай, як адзін работнік у Вільні пераказаваў другому ў памяці ўсю стацьцю пад загалоўкам „Старое Лякарства“.



Іван Луцкевіч.

Ня меншай папулярнасьцяй карысталіся і вершы, друкаваны у „Нашай Долі“. Гэная вялікая папулярносьць „Н. Д.“ зьвярнула на сябе увагу царскіх чыноўнікаў, і дзеля таго, што газэта, каторая бязьлітасна крытыкавала тагачасны лад і нікчэмную палітыку мясцовых расейскіх валадароў,—ім не падабалася, яны аб‘явілі вайну „Н. Д.“, і на газэту пасыпаліся кары. 3-і нумар „Н. Д.“ ўжо сканфіскавалі, так што толькі некалькі дзесяткаў экзэмпляраў яе ўбачылі сьвет Божы. З тэй пары бяз мала кожны нумар „Н. Д.“ спатыкала або канфіската, або штраф. Газэта—такі трывала. Навучаныя горкай доляй, мы часьць выданьня адразу з друкарні вывазілі ў прыватныя кватэры і толькі другую частку прывазілі ў друкарню, дзе на яе ўжо чакала паліцыя. Схаваныя гэткім спосабам нумары мы прадавалі потым па павялічанай цане, так што некальки часу ня гледзячы на канфіскацыю маглі-такі зьвясьці канцы з канцамі. Але пад канец і паліцыя дагадалася. Яна пачала канфіскаваць газэту ў самай друкарні і, нарэшце, на Яна Тукеркеса налажылі штраф і прыцягнулі яго да суду. А побач з гэным, баючысь уплыву „Нашае Долі“, мясцовыя ўлады выдалі цыркуляр, у якім гаварылася, каб усе нумары „Н. Д.“ канфіскаваць, як газэту „исключительно вреднаго направленія“, так гаварылася ў цыркуляры. Стала ясна, што пры гэткіх варунках газэту выдаваць не магчыма. Папаўшы ў „гісторыю“, Ян Тукеркес адмовіўся даваць грошы. На пасяджэньні рэдактарскай калегіі, калі разглядалася пытаньне аб тым, як быць далей, Ян Луцкевіч абяцаўся дастаць грошы, і гэтак мы пастанавілі газэту выдаваць далей, перамяніўшы трошкі тон.

Але з перамены тону ня вышла нічога. Пробны нумар, у якім мы зрабіліся ціхімі і спакойнымі, так сама быў сканфіскаваны. Чыноўнікі прычапіліся да слова „ваявяць“ у вадным з вершыкаў, дзе яно азначала звычайную барацьбу, змаганьне,—растлумачыўшы яго, як прызыў да паўстаньня з аружжам у руках. Тады мне стала ясна, што „Нашай Долі“ ужо падпісаны прыгавар і дні яе зьлічаны і ніякая перамена тону нічога ўжо не паможаць. І дзеля таго, ня гледзячы на намовы братоў Луцкевічаў, я зрабіў заяву у газэтах, што „Наша Доля“ сваё існаванае спыняе. Гэтак на 7-м, здаецца, нумары, задушаная рукамі расейскага ката скончыла сваё існаваньне „дзіця свабоды“ першая беларуская часопісь „Наша Доля“.

Дзядзька Пранук.

30 верасьня будзе сьпісаньне насяленьня.

Галоўны статыстычны ўрад Польшчы ў адозьве „Што нам дасьць сьпісаньне насяленьня?“ аб‘яўляе, што сёлета 30-га верасьня адбудзецца агульнае аднадзённае сьпісаньне насяленьня на ўсім прасторы Польскай Рэчыпаспалітай. Разам з гэтым будуць запісываць жылыя дамы, гасподы (кватэры), земляробныя, гароднія і лясныя гаспадаркі ды свойскую жывёлу. Аб гэтым сьпісаньні ў нас блізу нічагусенькі ня ведама, навет вестка аб гэтым ня была надрукавана ў хроніцы беларускіх газэт, а тымчасам ад рэзультатаў сьпісаньня будзе залежыць шмат што ў жыцьці беларускага народу, Для нас найважнейшае значэньне мае сьпісаньне насяленьня, асабліва тыя яго пункты, дзе кажацца аб мове і нацыянальнасьці. На што-ж робіцца сьпісаньне насяленьня? На гэта нам дае адказ тая ж адозва, дзе, паміж іншым, кажацца: „асабліва цікавіць будуць, злашча ў цяперашнюю часіну, пытаньні аб веры, бацькаўскай мове і нацыянальнасьці“, а далей „значная часьць няпольскага насяленьня пакінула межы гаспадарства, і трэба думаць, што цяпер процэнт польскага насяленьня з мовы і пераканаьняў шмат вялікшы, чымся паказуюць прадваенныя матар‘ялы“ і, апрача пытаньня аб роднай мове, ёсьць пытаньне: „да якой залічае сябе нацыянальнасьці?“

Праектуецца азначаць нацыянальнасьць ня толькі па мове, але і па пераканаьні, ці інакш, што маняцца залічаць да палякоў і людзей, якія гавораць не папольску, а значыць запраўды не палякоў, абы толькі дастаць у іх згоду на польскасьць. Як дастаюць гэткія згоды некаторыя статыстычныя агенты, мы ўжо ведаем. Паказаць большую лічбу палякоў будуць хацець ня дзеля нацыянальнае гордасьці, а дзеля рэчаў балей карысных, як гэта бачым з слоў, што пытаньне „аб роднае мове і адчасьці так сама веры, дазволіць абаперці школьную палітыку на рацыянальнай аснове“. Значыцца, як-бы абяцаецца, што працыянальна да статыстычных даных будуць нацыянальныя школы. І хоць мы, навучаныя польскаю школьнаю палітыкаю ў Беларусі, перасталі ўжо спадзявацца справядлівых адносін да нас многіх польскіх адміністратараў, аднак важна, каб лічба беларускага насяленьня была паказана не такой, як гэтага хочацца тым, ці іншым польскім урадоўцам, а якой яна ёсьць запраўды. Небясьпечнасьць ёсьць яшчэ і з другога боку—гэта што чарнасоценныя расейскія элемэнты будуць навучаць нашых праваслаўных прыхаджан называць сябе «рускімі».

Важна тут яшчэ тое, хто будзе апытываць: мясцовыя цывільныя людзі ці не, бо калі будуць пытацца аб нацыянальнасьці жандары, паліцыянты, стражнікі «straży kresowej» (стражы кресовай) і г. п., дык яны патрапяць дастаць у чалавека згоду ня толькі, што ён паляк, але навет, што кітаец.

Усе беларусы бяз розьніцы веры павінны цьвёрда адказаць, што яны беларусы. Помніце, што ад гэтага залежыць дабро ўсіх нас беларусаў і нашых дзяцей.

Пётра Станіч.

На стойкі, дарогі ганяюць ў нядзелі,
Каб яны ў жыцьці пэцехі ня мелі!
Чаму на старожу прысьці апазьніўся?
Чаму ты сякеры, рыдля ўзяць забыўся?
Дзе твой мех, рэшата і сечка?
За што там такое з войтам была спрэчка?
Браварну старожу адбывай бяз шчоту,
Там і ў дзень і ў ночы ня скончыш работу!
А ў валоўні, як чорт у пекле, таўчыся,
Нямаш там спогадзі, ці плач, ці маліся,
Ці дождж, ці завея, ці мароз найбольшы,
Чым горшае надвор‘е, то тым прыказ горшы.
Уставай да работы парою бяз спрэчкі,
Выцягнуць з-пад лавы, сьцягнуць цябе з печкі:
Ты йдзі малаціці, ты у млын малоці,
Картоплю садзіці, ты ідзі палоці,
Таму быдла пасьвіць, а таму гавечкі,
Ты да коп на варту, ты ідзі да грэчкі,
Ты ступай да коней, а ты за сьвіньнямі,
Малая да качак, больша за гусямі.
Як чорта піхаюць, ўсюды слухаць трэба,
Часта нямаш калі зьесьці куска хлеба,
Днём стравы ніколі цёплай не скаштуеш,
Палудзень кароткі, сапнуць няма часу,
Ад цівуна, войта давольна крыку, галасу;
А ўраднік, як чорт, сярдзіты і злосны,
Погляд быстры, строгі і голас даносны,
Як стане пасвойму лаяць і крычаці,
То душа і з целам мусіць раставаці;
А на злосьць як трапім, то пачысьціць зубы,
Схопіш аплявуху, аж кроў пойдзе з губы,
Чупрына ня пеўна, бо падскубе куса,
Паправіць бароду і падскубе вуса.
А што страху надасьць, а што надрыжышся,
Ці плач ці скач перад ім, ці як хоць маліся,
Нічога то не паможа, чакаць канца мусіш,
Хоць праўда, аднак-жа, языка прыкусіш.
— Зараз каркі скруцяць! гэта урвецца,
Хванабэрства згіне, панства іх мінецца.
Няхай дасьць Бог толькі вольнасьці прыждаці,
Будуць паны самі сьлёзкі палыкаці;
На полі, дзе колісь сох было як маку,—
Ня знайдуць загона і ральлі ні знаку,—
Усё ляжа адлогам, лазы будзе воўку,
Зьвяжуць паны скора бяз людзей галоўку;
А па сенажацях ня пойдзеш за лесам,
Бо хто-ж будзе касіць? Хіба ён сам з бесам!
Прыгон як урвецца і талакі ня стане,
Скончыцца адразу іхна панаваньне;
Тады яны хіба, што бяда, пазнаюць,
Бо, цяпер ніколі нам не спагадаюць:
Ідзі толькі, хаме! От і ўся гаворка!
З нашай працы грошы складаюць да ворка.
Дай нам Божа толькі скоранька прыждаці,
Каб маглі спакойна пасядзеці ў хаце,
Пана не баяцца і войта загаду,
Было-б у нас болей і дабра і ладу.
Не адзін сказаў-бы: „Мой пане Сьцяпане,
Будзь ласкаў, сягоньня прыдзі на гараньне,
Заплачу, што хочаш, водкай пачастую,
А для тваіх дзетак гасьцінца дарую;
Калі ласка, заўтра падбяжы з касою,
Жонка, дочкі з серпам, а сын з бараною,
Наўперад грошы, бо мне раз плаціці,
Бо я цябе знаю, ня ўмееш круціці“.
А ось калі ліха як вужа прыцісьне,
Не адзін застогне і не адзін пісьне,
Бо годзе над намі зьдзекавацца срога,
Прыдзе і на пана караньне ад Бога.
Яны нас глумілі, плакаць не давалі,
Вінен ці ня вінен, без канца каралі,
А цяпер ім самым тое дастанецца,
Што нам дасюль была, то на іх шчаўпецца.
Няхай дасьць Бог цару нашаму здароўя;
Няхай нашай долі скаштуюць пансве;
Няхай яго радні Бог шчасьце гатуе,
Што ён нашых братоў вольнасьцю даруе.
А тым нашым паном, што нас вельмі дралі,
Даў-бы Бог, каб яны на сабе дазналі:
Галоднаму сыты спагадаць ня мусіць,
Пакуль чужой бяды сам у губе ня ўкусіць.
А ось тагды пазнаюць, па чаму хвунт ліха,
Як воўк пад лаваю, ня ўлежаць ціха,
Паскрабуць чупрыну, як ня стане хлеба,
Як Бог і цар схоча, мусіць так і трэба.
Можа-б болей бздырыў-бы Сьцяпану Даніла,
Але на пагібель войта накруціла,
Як стаў загад строіць, як пачаў крычаці,
Мусілі гутарку сваю перастаці.

„Lud Białoruski“.
М. Федароўскага.

Размова пана з мужыком пасьля прыгону.

— Як маешся, Сьцяпане?
— Аджыў, найясьнейшы пане!
— Чаму твая Дарота
Ня прыходзі до мне на работа?
Сушыць, грабіць пільне трэба,
Дам пенёндзы, дам і хлеба.
— Ужо панскі хлеб дакучыў,
Як пан нас добра мучыў:
Добра паны гандлявалі,
Слугі на сабакі мянялі!

Ст..-ка.

Беларускае мучаніцтва.

(Пярэдрук з газэты „Kгуnіса“, (Крыніца) № 29).

„Ніжэй друкуем сьпісак беларускіх вучыцялёў, якім польскія школьныя інспэктары адпялі вучыцельскія пасады. Дагэтуль зводьнены такія вучыцялі:

№№	ІМЯ і ПРОЗЬВІШЧА ВУЧЫЦЕЛЯ.	ДЗЕ ШКОЛА.	ЯКУЮ ШКОЛУ СКОНЧЫЎ ВУЧЫТЕЛЬ.
1	Рагель Васіль	Дубіна Баярская	Выдзержаў экзамен на вучыцеля
2	Станкевіч Міхал II	Гарадзечына	„ „ „
3	Скадроў Арсень	Малая Дайнава	„ „ „
4	Сьліж Платон	Лоск	3 клясы духоўнае сэмінары
5	Сівец Тацяна	Пагарэльшчына	5 кляс гімназіі
6	Шаўлюк Антон	Скрыплева	3 клясы вучыцельскае сэмінары
7	Жываткевіч Даніла	Малое Запрудзьдзе	4 клясы вышэйшай пачатковай школы
8	Нарадовіч Мікалай	Заберазь, Бакшчанскае в	„ „ „ „ „
9	Каваленак Нікан	Ягадзен „	2 клясы вучыцельскай сэмінары
10	Сецька Антон	М. Вішнева	4 клясы выш. пач. школы
11	Стафановіч Мікалай	Мілкі Трабскае вол.	5 кляс рэальнае школы
12	Падлахоўскі Павал	Казарэзы, Палачанскай в.	Вышэйшую пачатковую школу
13	Іванова Мар‘я	Чарапу	5 кляс гімназіі
		Вялейскі пав. Маладзечненская воласьць.	
14	Жабінская Ганна	Цюрлі	Вучыцельскую школу
15	Шунько Аўгеньня	Рагозу	4 клясы гімназіі
		Лебедзеўская вол.	
16	Шыман Аўдоля	Вяжуці	Вышэйшую зялезна-дарожную школу
17	Івашкевічанка Зінаіда	Марозькі	7 кляс гімназіі
18	Міцька Аркадзь	Скавародкі	6 кляс гімназіі
19	Сіцька Янка	Насілава	Вышэйшую пач. школу
20	Юшкевічанка Васа	Цюрлі	2 клясы вучыцельск. сэмінары
21	Маяйка Вольга	Запалякі	7 кляс вілен. епарх. шк.
22	Міцька Міхал II	Маркава	4 клясы гімназіі
		Валожынская в.	
23	Кароль Сымон	Вёска Даўбені	Скончыў вуч. інстытут
24	Белановіч Тамаш	„ Маршалкі	Выдзержаў экзамен на вучыцеля
25	Шчуцкі Сьцяпан	„ Лужаны	Скончыў вучыц. сэмінарыю
26	Будновіч Якім	„ Зураўкі	Ск. вышэйш. 4-х кл. нач. школу
27	Маеўскі Канстантын	„ Стаўкі	Ск. 5 кляс духоўнай сэмінарыі
28	Лоўчы Ігнась	„ Замасьцяны	Ск. вучыцельскую школу
29	Лоўчы Янка	„ Рачаняты	Выдз. экстэрнам на вучыцеля
30	Рубацкі Антон	„ Брылкі	4 клясы гімназіі
31	Іода Валентына	„ Рум	„ „ „
32	Кавалеўская Вера	„ Аўгустова	„ „ „
33	Цяжолы Павел	„ Панізьзе	Выдзержаў экзамен на вучыцеля
34	Маеўская Марыля	„ Валожына	„ „ вучыцельку
35	Федаровіч Янка	„ Мінькі	Ск. вучыцельскія царкоўн. курсы.
36	Карнаух Алёна	„ Бабровічы	Выдз. экзамен на вучыцельку
		Палачанская в.	
37	Станкевічанка Вольга	Вёска Гарадзілава	6 кляс гімназіі
38	Янчуковічанка Зофія	„ Быкі	4 клясы гімназіі
39	Філіповіч Канстантын	„ Палачаны	Ск. рэальную школу
40	Шпакова Ганна	„ Палачаны	4 клясы гімназіі
41	Шпакова Вольга	„ Кабылкі	Выдзержала экзамен на вучыцельку
42	Шпак Спірыдон	„ ВялікаяСяло	Ск. пав. школу
43	Янчуковіч Мікалай	„ Літва	4 к. мейск. і 2-х г. пэдаг. к. у Сьвенц
		Забрэзкая в.	
44	Андрушкевіч Хведар	Вёска Дайнова	Вялейскую вучыцельскую школу
45	Казакевіч Янка	„ Дубіна	4-х кл. вышэйшую пачатк. школу
46	Пётра Рэут	„ Куцяняты	„ „ „ „ „

Разглядаючы адукацыю гэтых нашых вучыцялёў, мы бачым, што яе ім хватае, каб быць вучыцялем. Знача, яны зволънены толькі дзеля таго, што яны беларусы. Вось дзе наша найвялікшая крыўда, вось дзе зьдзек над намі польскага чыноўніка, вось дзе наша народнае мучаніцтва! А ўсё гэта не на сьмерць нам, а на жыцьцё. Праз гора і нядолю і праз змаганьне да адраджэньня паднявольнай сваей Бацькаўшчыны—Беларусі!“

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце яе на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзець больш падпісчыкаў, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісывацца, бо ад гэтага залежаць далейшае жыцьцё „Беларускіх Ведамасьцей“. Хто ня умее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце усе разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і соцыяльных ворагаў і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Годзе нам спаць, годзе нам быць самым адсталым народам. Браты, прыміце блізка да сэрца усе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб „Беларускія Ведамасьці“ у вашым раёне выпісываліся і пашыраліся. Хай жывець народная справа!

Украінскае жыцьце.

„Газ. Веч.“ паведамляе, што адкрыцьце украінскага унівэрсытэту ў Львове адбудзецца за колькі дзён. Цяпер ідуць запісы. Заявілася блізу 3.000 студэнтаў. На чале прафэсарскага пэрсаналу, які складаецца пераважна з маладзейшых сіл, стаіць доктар Шчурат. Кошты на унівэрсытет будуць ісьці з амерыканскае пазычкі, якая дала дагэтуль каля 600 тысяч доляраў.

„Українські Голос“, які выходзіць у Вініпегу, паведамляе, што туды прыехаў мітрапаліт Шаптыцкі, маючы на мэце помач пацярпеўшым украінцам.

Літоўскае жыцьце.

У нядзелю 18 верасьня ў Мястовым Ковенскім тэатры адчыніўся сэзон Літоўскай драмы. Ставілася новая арыгінальная п'еса „Valdowo Sunus“ (Сын Валадара), лірычная драма маладога і таланавітага поэта Пуцінаса (аўтор жывець у Швэйцарыі). П'еса маець шырокі замысел і сустрэчана літоўскай крытыкай з вялікаю спагадаю.

У Коўню вярнуўся з Савецкай Расеі прарэктар Пецярбурскага Палітэхнічнага Інстытуту, прафэсар архітэктуры п. Сангайла і распачаў сваю навуковую працу.

У Коўні адбыўся канцэрт на карысьць грамадзян Літвы, галадуючых у Савецкай Расеі.

У № 212 літоўскае часопісі „Vilnius“ за 21 г.м. знаходзім гэткую заметку аб Літоўскай Гімназіі:

„Учора, 20 верасьня, 1-я Віл. Мужчынская, Гімназія атрымала з Дэпартамэнту Адбудовы, Гандлю й Прамысловасьці пісьмо з трэбаваньнем, каб Літ. Гімназія апаражніла да 20 верасьня (? Рэд) будынак гімназіі разам з кватэрай дырэктара і старажоў, дзеля таго што будынак перадаецца Дэпартамэнту Прасьветы. Літ. Гімназія павінна да Новага Году знайсьці сабе памяшканьне, а, пакуль што, мае права весьці заняткі ў тым самым будынку пасьля палудня. Вось, дык польская справядлівасьць“.

Савецкая Беларусь.

Беларускі Камісарыят заграпічных спраў ў астатні час распачаў сваю заграпічную палітыку, якая робіцца ў цеснай сувязі з Масквою, дзе беларускім паслом т. Мароз.

Новастворапы Камісарыят зьбіраецца адчыніць за граніцаю пры прадстаўніцтве Рас. Соц. Федэр. Сав. Рэсп. асобныя консульствы, першым чынам у Чэха-Славакіі і Латвіі.

Поэт Якуб Колас скончыў сваю поэму „Сымон Музыка“, якой дагэтуль было надрукована толькі пяць часьцей.

Кіраўніком Беларускага Палітэхнікума ў Менску выбран вядомы культурна-нацыянальны працаўнік грам. Васілевіч.

Рэктарам Беларускага унівэрсытэту ў Менску выбран прафэсар Пічэта. Лекцыі чытаюць: акадэмік Карскі, праф. Любаўскі, праф. Эпімах-Шыпіла, праф. Янчук і інш.

Поэты Янка Купала, Якуб Колас і некаторыя пісьменьнікі, разам з прафэсарамі, працуюць у камісіі па ўкладаньню беларускай тэрміналёгіі.

Поэт Якуб Колас, які нядаўна вярнуўся з Маскоўшчыны ў цяжкім матар'яльным становішчы, дастаў авансам 4.000.000 савецкіх рублёў за зборнік сваіх новых твораў, які ўжо друкуецца і неўзабаве выйдзе ў сьвет.

Зьезд рабочых-хімікаў Савецкай-Беларусі адзначыў павышэньне вытвору ўсіх прадпрыемстваў у зьвязку з ажыцёўленьнем новай эканамічнай палітыкі. Картонная фабрыка пачала вырабку картона, годнага для вываза за граніцу. Усе шкляныя і серчыкавыя фабрыкі забасьпечаны сырцом на доўгі час. („Новый Путь“).

Савецкі маскоўскі ўрад дазволіў фэдэратыўным і аўтономным Савецкім рэспублікам друкаваць свае ўласныя грашавыя знакі. Маюць зьявіцца беларускія савецкія грошы з беларускімі напісамі.

ЭКАНАМІЧНЫ АДДЗЕЛ.

15 верасьня ў Ігналіне Сьвенц. павету цэны былі вось якія: жыта 1400—1500; пшаніца 2000, авёс 1000, салома 100, бульба 300, семя альняное 1500, цыбуля 15—25, яблыкі 500—600, хлеб разовы 40, яйкі 13, сыры 90. Збожжа на рынку было дужа мала, за тое альняным семям завален увесь рынак.

14 верасьня у Дукштах, Браслаўскага павету, цэны былі гэткія: жыта 1400—1500, пшаніца 1600, ячмень 1000, авес 900—1000, бульба 350—400, семя альняное 1500—1600, гарох 1100, масла 350, яйкі 170—180, сыры 100—150. З Вільні прыехала дужа многа сьпекулянтаў для скупкі. Вываз збожжа ў Літву Сьродковую забаронены.

Для падзелу каапэратывам Аддзелы Віленскага саюзу каапэратываў у Залесьсі і Беняконях атрымалі проста з капальняў 2 вагоны белай солі важонкі.

На 26 верасьня у Вільню запрошаны Саюзы каапэратываў: гор. Вільні, Цэнтраля Таварystваў Ральніча-Гандлёвых, Наваградзкі, Слонімскі, Лідзкі і Аддзел „Сполэма“ (Польскага Саюза) у Баранавічах для абгаварываньня аб будучай супольнай працы.

Дэпартамэнт Аправізацыі атрымаў да 50 цыстэрн нафты. У Вільні фунт нафты па каапэратывам прадаецца па 19 мар.

Як заяўляе „беларус“ і „каапэратар“ Турчыновіч, — быўшы Старшыня Саюзу Каапэратываў у Менску (Цэнтрабелсаюз), а цяпер загадчык філіі „Сполэма“ ў Баранавічах (Польскага Саюзу Спажывецкіх Таварystваў), — Сполэм мае замер Лідзкі ці Наваградзкі Саюз далучыць да сябе і зробіць сваей пляцоўкай.

Дырэктар Дэпартамэнту Аправізацыі п. Бабянскі падаўся у адстаўку. Прычынай называюць тое, што Дэлегатура ўмешывалася ў справы Дэпартамэнта і робіла ўноскі, з якімі не згаджаўся п. Бабянскі.

Віленскі саюз каапэратываў спадзяецца у хуткім часе атрымаць: 2 вагоны цукру, 1 вагон серчыкаў, 1 вагон саганоў, 1 ваг. эмалёванай пасуды, 1 ваг. шкла да вакон, 5 вагонаў селядцоў і да 200 пудоў скуры падашвянай.

Вышаў № 6 каапэратыўнай часопісі „Kooperacja“ (Малая Пагулянка 12), які выдаецца у 4 мовах: беларускай, польскай, літоўскай і жыдоўскай. Шчыра рэкамэндуем усім нашым чытачом гэту часопісь, як орган чыста эканамічны, без усякай дамешкі палітыкі.

Віленскі саюз каапэратываў у жніўні месяцы купіў тавараў на суму 9.860.477, а прадаў тавараў на суму 15.150.521. У дзень, у сярэднім гэты саюз прадаваў тавараў на суму 582.721.
(Kooperacja).

Згодна з пастановай зьезду паўнамоцнікаў Віленскага Саюзу Каапэратываў у бліжэйшым часе будзе пададзены на зацьверджаньне статут Віленскага Каапэрацыйнага Банку.
(Kooperacja).

У Залесьсі адчынена ні то прыватная гуртоўня, ні то нейкі ўрадовы аправізацыйны склад, які мае соль, цукер і г. д. і празываецца ён: „Беларускім Саюзам“. Кажуць, што каапэрацыяй у Залесьсі заняўся знаны беларускі „дзеяч“ п. Аляксюк. (Kooperacja).

ХРОНІКА.

У чародным нумары нашай газэты будзе надрукован Статут Таварystва Беларускае Школы. Вучыцялі і ўсе, каму дорага справа роднае культуры, павінны абавязкова мець гэты нумар і пашыраць яго сярод грамадзянства. Нумар будзе надрукован у большым ліку экзэмпляраў.

Віленскія польскія газэты „Газэта Краёва“ і „Слово Віленьске“ зьмесьцілі аднакавыя хронікерскія заметкі аб тым, што „Беларускія Ведамасьці“ — праціг зачыненай „Нашай Думкі“. Ня гневаемся на гэтыя, мабыць, мімавольныя падказы начальству, бо ведаем, што на чале віленскай прэсы стаіць п. Чэслаў Янкоўскі, які лепей за гэтых газэт разьбіраецца ў беларускіх справах, і думаем, што гэта ня віна ні п. Хамінскага, ні п. Алейнічукоўскага, а звычайная прамашка якога-сь малакультурнага супрацоўніка

Паведамляем украінцаў, жывучых у Вільні, што рэдакцыя нашай газэты дастаець шмат украінскіх газэт розных кірункаў, як з краю, так і з эміграцыі, з Амер. Злуч. Штатаў і з Канады, і з прыемнасьцю будзе даваць братам-украінцам для прачытаньня.

Польская газэта „Наш Кур'ер“ падае ведамасьць з ангельскай газэты аб жудаснай долі ўцекачоў, якія варочаюцца з Расеі і знаходзяцца ў лагеры ў Баранавічах. У лагеры тым згруджываецца дзесяткі тысяч уцекачоў. У ліпню месяцы баранавіцкі лагер, маючы драўляныя баракі, разьлічаныя на 4 тысячы, зьмяшчаў у сабе 50 тысяч уцекачоў, якія мусілі чакаць рэестрацыі і дэзінфекцыі. У часе быцьця у Баранавічах ангельскага карэспандэнта, эвакуавана стуль 20 тысяч уцекачоў, якія пяць дзён туліліся на вуліцы. Трапляецца, што цэлыя сем'і знаходзяцца з крайнасьці ў бліжэйшых акопах. Карэспандэнт дзівіцца здольнасьці чалавечай істоты знасіць гэтулькі мучэньняў.

Карэспандэнт „Роботніка“ ў № 226 ад 24 г. жніўня піша.

„16 гэтага жніўня (аўгуста) ў канцэлярыю Рацькаўскай воласьці Наваградзкага павету прышоў камэндант 2 роты 25 палку уланаў падпаручык Астоя і запатрабаваў зараз-жа апаражніць будынак воласьці, а таксама даставіць 20 падвод.

На увагу заступніка войта Краскоўскага, што загад п. Камэнданта ня можа быць выпаўнен, як спрэчны з атрыманымі інструкцыямі ад павятовага старасты, ўсёж-такі гэны камэндант катагарычна запатрабаваў спаўненьня свайго загаду.

На заўтра п. Камэндант ізноў зьявіўся у канцэлярыю воласьці, ужо не адзін, а разам з 10 варужонымі уланамі і паўтарыў сваё жаданьне.

Раздражнёны адмоўным адказам, зьбіў на сівы яблык секратара воласьці п. Казімерчыка, а пасьля зьняважыў заступніка войта п. Краскоўскага, прыказаў яго арыштаваць і адвясьці у паліцыю, дзе у прысутнасьці камэнданта паліцыі пабіў яго да крыві.

П. Краскоўскі, сын селяніна-гаспадара, быўшы студэнт права, зьвярнуўся з жалабай да Наваградзкага старасты, але пан староста парадзіў яму гэную справу уладзіць палюбоўна, і толькі дзякуючы энэргічнаму жаданьню п. Краскоўскага, сьпісаны быў пратакол.

У воласьці запанавала вялікае хваляваньне— сымпатыі да „улан“ значна астылі, бо перад гэтым былі выпадкі іхняй самаволі і бясправя над мясцовай люднасьцю.

Прычына гэтага смутнага здарэньня ляжыць у тым, што паны афіцэры вядуць бязчыннае жыцьцё і шукаюць усюды бальшавізму“.

12 верасьня пачаліся заняткі ў Беларускай пачаткавай школе № 4, што на Зарэччы. Перад вучэньнем сьвяшчэньнікам аццом Плісам быў адслужаны малебен. Школа маець II клясы. Навука і падручнікі дармовыя.

Адрэс школы Філярэцкая 12;

З пеўных крыніц мы даведаліся, што дэпартамэнт асьветы Сярэдняй Літвы не згаджаецца на зацьвярджэньне істнуючай ужо чацьверты год і перафармованай улетку гэтага году Беларускай Гімназіі ў Вільні. Дэпартамэнт вымагае выкладаньня усіх навук у старшых клясах гімназіі (6-8) на польскай мове, тады як цяпер яны выкладаюцца на беларускай, за выключэньнем (часовым) матэматыкі. Чым выклікана такое вымаганьне, проста трудна сьцяміць.

Служачыя гімназіі, дзякуючы такому палажэньню, вот ужо скора два месяцы не атрымліваюць пэнсіі, і калі ім яе выплацяць, ня ведама. А тым часам марка падае, цэны растуць, і калі пэнсія будзе атрымана, то каштоўнасць яе не па віне гімназіі акажацца ў два або ў тры разы меншай, чым у свой час.

Бяда ды й толькі!

28 жніўня ў м. Бараўцы Ілукстскага павету адбыўся беларускі сьпектакль. Дзьвінская беларуская трупа Таварystва „Бацькаўшчына“ з вялікім усьпехам паставіла п'есу Ф. Аляхновіча—„На Антокалі“.

Тая-ж трупа, з прычыны сканчэньня Беларускіх Вучыцельскіх Курсаў, паставіла гэтую п'есу для курсантаў у Дзьвінскім Гарадзкім Тэатры.

27 верасьня Беларускі Асобны Батальён у Незалежнай Літве будзе сьвяткаваць першыя ўгодкі свайго існаваньня. Ахвіцэры батальёну пастанавілі ахвяраваць усе грошы, сабраныя на абед у дзень гадавога сьвята, на галадуючых Савецкае Беларусі.

Саюз Работнікаў Хлебаробаў 11-га верасьня згуляў беларускае ігрышча ў м. Рудоміне Віленскага павету. Паказана было: „Чорт і баба“—Ф. Аляхновіча і „Зьбянтэжаны Саўка“—Л. Родзевіча. Людзей было бітма набіта.

У месьце Клецку, Несьвіжскага пав., за апошнія часы адбыліся пад кіраўніцтвам грам. Русака два сьпектаклі 27 жніўня і 4 верасьня. Ставілі „Птушку шчасьця“ Аляхновіча.

Вышла з друку і прадаецца ў Беларускай кнігарні „Элемэнтарная альгэбра паводле Кісялёва“. Пераклаў на беларускую мову Антон Луцкевіч. Цана 250 мар.

У в. Арляняты Крэўскай воласьці, дзе жывуць адны каталікі і ўсе сьвядомыя беларусы, сёлета скрозь увесь год была свая беларуская пачатковая школа. Вучыла ў школе вельмі добра прыгатаваная вучыцелька Марыя Станкевічанка. Дзяцей вучылася 75. Людзцы нашыя не маглі нацешыцца з свае школы. Аж тут нядаўна ні з таго ні з сяго прысылае ў гэтую вёску школьны інспэктар польскую вучыцельку. Але гаспадары на польскую школу не згадзіліся і вучыцелькі не прынялі. Арляняты дамагаюцца беларускае школы.

У Управу Саюзу работнікаў сельск. гаспадаркі паступіла заява ад рандатара Язэпа Гроця, з маёнтку Віткі, Варнянскай воласьці, жаліцца, што пан Дзеканскі яго высяляе, ня маючы на гэта ніякае асновы.

Парабак маёнтку Пілепы, Браніслаў Рынковіч жаліцца, што „Ochrona Serca Jezusowego“ (Охрона Сэрца Езусовэго) звальняе яго з службы ў маёнтку, а таксама і з кватэры. Паміж іншым Браніслаў Рынковіч праслужыў чатыры месяцы самага гарачага летняга часу, дастаючы толькі па 3 пуды збожжа і 200 марак на месяц. Цяпер ён застаецца на волі лёсу з сям'ёю, бо ня мае ніякіх спосабаў да жыцьця.

Праўленьне Саюзу раб. сельск. гасп. выказвае шчырую падзяку ніжэймененым асобам, ахвяраваўшым на саюз: 1) А. Карабач—5.500 м., 2) М. Міхалоўскі—100 м., 3) К. Мілош — 100 м., 4) С. Карповіч—100 м. Разам—5.800 м.

Скора у Радашкавічах адчыняецца беларуская рэальная школа з 7 клясамі.

Беларус гароднік, лясьнік, сторож могуць дастаць службу ў хвальварку пад Вільняй. Зварочавацца у Беларускую кнігарню (Вільня, Завальная 7).

У суботу 17 верасьня у Віленскім Беларускім Музыкальна-Драматычным Гуртку было ігрышча. Згулялі дзьве п'есы. Асабліва добра была згуляна п'еса „Я памёр“.

17—19 верасьня ў Вільні адбыўся зьезд так званых „тэрціярак“ (жанчын, спаўняючых трэці закон сьв. Францыска для сьвецкіх людзей). Зьезд не абмяжываўся пытаньнямі веры, але заняўся і палітыкай. Сярод кіраўнікоў зьезду знайшліся агітатары за „ўцаленьне“ (далучэньне) нашага краю да Польшчы. Падбіты нягоднымі асобамі, зьезд цёмных і фанатычных „тэрціярак“ пастанавіў выгнаць беларусаў з Сьв.-Троіцкага манастыра, царкву адабраць на касьцёл, а ў мурох, дзе цяпер гімназія, зьмесьціць архіў. Адным словам, языкі доўгі, а рукі кароткі!

У дворы Мерач-Вількішкі Тургельскай гміны Віленскага павету пан І. Максімаў у пачатку вайны выехаў у Расею і прасядзеў там да чэрвеня г. г. За гэты час парабкі абраблялі усю зямлю самі ці то пад загадам розных акупантаў сваей скацінай і прыладамі. Цяпер-жа гэты пан выгнаў на голад і холад 18 душ парабкаў, без усякай прычыны, ня гледзячы на тое, што гэтыя парабкі служылі у яго ад 12 да 15 гадоў.

23 верасьня ў Вільні адбыўся арганізаваны эндэкамі мітынг, які посьле прамоў, рушыў к дварцу генарала Жэлігоўскага з песьнямі „Ешчэ Польска не згінэла“ і інш. Генарал Жэлігоўскі ня выйшаў. Замест яго сабраных супакоіў Старшыня Тымчасовай Камісіі г. Макжэцкі, посьле чаго мітынг разыйшоўся.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Вялікая радасьць у Коўні.

РЫГА (Польпрэс). Ковенскі карэспандэнт Л. Т. А. даносіць, што 18 гэт. мес. урад дастаў з Жэневы абшырную дэпешу, у якой сказана, што спрэчка за Віленшчыну разьвязана на карысьць Літвы. Ведамасьць тая зараз абляцела усё места. Шмат дамоў прыбралася ў нацыянальныя флагі. Надвечар перад Соймам сабралася вялізная патрыятычная маніфэстацыя.

Растрэл украінскага поэта.

Украінскія часопісі паведамляюць, што ў Кіеве растрэлен таланавіты украінскі поэт Чупрынка.

Аўтокефалія праваслаўнай царквы ў Польшчы.

ВАРШАВА, 23—IX (ПАТ). Праваслаўныя архірэі Польшчы выказалі маскоўскаму патрыарху жаданьне, каб згодзіўся на аўтокефалію (самакіраваньне) праваслаўя ў Польшчы.

Курс на грошы ў Вільні.

24 верасьня 1921 г.

Царскія (100)	850
Нямецкія маркі (1000)	56,25
Ост-маркі (1000)	54
Фунты штэрлінгаў	23000
Доляры	5640
Золата рублі (100)	238.500

АБВЕСТКА

З дазваленьня Міністэрства Веравызнаньня і Прасьветы Грамадзянская Прыватная Жаноцкая Гімназія у Несьвіжы аднаўляе сваю дзеяльнасьць у 1921-22 вучэбным годзе.

Прадметы у клясах 3, 4, 5, 6, 7, і 8 будуць выкладацца у расейскай мове, у клясах 1 і 2 у беларускай мове. Прыймовыя экзамены ва ўсе клясы і пераэкзаменоўкі пачнуцца з 26 верасьня.

Па заканчэньні экзаменаў пачнуцца клясныя заняткі.

Утрымацель Прыватнае Жаноцкае Гімназіі ў Несьвіжы У. Жаўнаркевіч. Дырэктар гімназіі К. Шчасновіч.

„БЕЛАРУСКІМ ВЕДАМАСЬЦЯМ“
патрэбны прадстаўнікі і карэспандэнты ўва ўсіх старонках сьвета.

Пачатковыя школы, бібліатэкі, чытальні могуць палучаць „Беларускія Ведамасьці“ **ДАРМА**, выслаўшы толькі грошы на перасылку газэты, (30 марак на 3 месяцы).

Усіх паважаных грамадзян войтаў і солтысаў, якім пасылаюцца „Бел. Вед.“, просім прысылаць нам адрасы сялян, якія таксама хочуць палучаць газэту.

Рэдактар-выдавец М. Гарэцкі.

Друкарня „ДРУК“, Субач 2